**Парфянцова А.В.,**
аспірантка кафедры
беларускай і сусветнай
мастацкай культуры

# НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ РАЗВІЦЦЯ МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XVIII СТ.

XVIII ст. — час фарміравання нацый, крышталізацыі нацыянальных культур. У гісторыю мастацкай культуры Цэнтральнай Еўропы гэтае стагоддзе ўвайшло як актыўны праваднік ідэй Асветы. Распаўсюджванне Асветы на Беларусі ў канцы XVIII ст., прыярытэт асветы, навукі і розуму ў жыцці асобы, грамадства і дзяржавы знайшлі сваё адлюстраванне ў розных відах мастацкай культуры.

У фарміраванні і развіцці ідэй Асветы вялікае значэнне мела архітэктурная спадчына Беларусі канца XVIII ст. Ва ўмовах крызісу феадальнага ладу ў архітэктуры адзначаецца развіццё новай стылявой з'явы ранняга класіцызму. Першыя ўзоры гэтага стылю ў палацавым будаўніцтве Беларусі адносяцца да 80-х гг. Тэндэнцыі класіцызму, характэрныя для помнікаў пераходнага тыпу ад барока да класіцызму, знайшлі сваё ўвасабленне ў збудаваннях у Ружанах, Свяцку, Шчорсах, Дзярэчыне. У культавым будаўніцтве найбольш раннім і значным помнікам класіцызму быў сабор Іосіфа, пабудаваны ў Магілёве ў памяць аб сустрэчы тут рускай імператрыцы Кацярыны ІІ з аўстрыйскім імператарам Іосіфам ІІ. Развіваючыся спачатку паралельна з познім барока, класіцызм з канца XVIII ст. стаў асноўным мастацкім накірункам у архітэктуры.

Логіка розуму абумовіла пранікненне перадавых горадабудаўнічых ідэй у вялікія і малыя гарады. Прывядзенне ў вядомы геаметрычны парадак вулічнай сеткі, спрамленне і пашырэнне асноўных магістраляў, стварэнне плошчаў, павелічэнне гарадской тэрыторыі — вось некаторыя задачы, якія вырашаліся ў праектных планах таго часу.

У аснову архітэктуры класіцызму былі пакладзены прынцыпы сіметрыі, геаметрызму, ураўнаважанасці аб'ёмаў, рэгулярнасці планіровачных рашэнняў, антычнай ордэннай сістэмы і простых дэкаратыўных формаў.

Скульптура канца XVIII ст. вызначаецца складаным і супярэчлівым характарам. З аднаго боку, у скульптуры, асабліва драўлянай, прасочваюцца водгукі позняга барока, а з другога — пануе класіцызм, які праявіўся літаральна ва ўсіх відах і жанрах мастацтва. Адно з важных месцаў належала станковай скульптуры, прадстаўленай шэрагам імёнаў, сярод якіх вылучаецца дынастыя Ельскіх — бацька Караль і два сыны — Ян і Казімір. Казімір Ельскі — першы прафесар скульптуры Беларусі, мастацтвазнаўца, кіраўнік кафедры скульптуры ў Віленскім універсітэце. За трактат "Аб сувязі архітэктуры, скульптуры і жывапісу" ён атрымаў ступень ад'юнкта.

Творчасць Казіміра Ельскага вельмі разнастайная па жанрах. Ён стварае чатыры фігуры пракокаў для галоўнага алтара касцёла св. Пятра і Паўла ў Вільні, 32 партрэты-бюсты перадавых дзеячаў культуры, буйных вучоных (Я.Снядэцкага, Ф. Смуглевіча, Я. Рустэма, І. Храптовіча і інш.).

Прынцыпам класіцызму кіраваўся ў сваёй творчасці Н.Астроўскі, вучань К.Ельскага. Працаваў пераважна ў малых формах (медальёны) і ў партрэтным жанры (галерэя бюстаў-партрэтаў гістарычных асоб і культурных дзеячаў Беларусі, Літвы і Польшчы: К.Ельскага, М.Агінскага, Ю.Корсака, Т.Нарбута, Т.Касцюшкі, Ю.Панятоўскага і інш.).

Такім чынам, у канцы XVIII ст. развіццё беларускай скульптуры рэгламентавалася двума мастацкімі стылямі — барока і класіцызмам. Класіцызм, які нёс прынцыпова іншыя якасці, уключаўся ў мастацкую культуру паступова. У беларускай скульптуры ён вызначаецца своеасаблівымі і стрыманымі формамі і застаецца верным праўдзе жыцця. Скульптура паступова адрываецца ад архітэктурнага асяроддзя, становіцца камернай, аўтаномнай і характарызуецца разнастайнасцю стылявых рашэнняў.

Найважнейшым цэнтрам Асветы на Беларусі пачынаючы з XVI ст. быў Віленскі універсітэт. Але ў перыяд Асветы яго значэнне мае асаблівы характар: элементы дэмакратызацыі навукі, як і ўвогуле ведаў, садзейнічалі абуджэнню "краявога патрыятызму", які выявіўся ў навуковых працах выкладчыкаў — мастакоў універсітэта.

У асяроддзі эпохі Асветы заканамерным стала і адкрыццё пры Віленскім універсітэце кафедры мастацтва ў XVIII ст., якая ў літаратуры атрымала назву Віленскай мастацкай школы, куды прымалі асабліва здольных, нягледзячы на іх сацыяльнае паходжанне.

У творах выяўленчага мастацтва таго часу мастак звяртаецца да свецкіх сюжэтаў. З'яўляецца вялікая цікавасць да гістарычнай тэматыкі (І. Рапалеўскі). Характэрнай адзнакай часу стала развіццё партрэтнага жанру (К.Гескі).

Эпоха Асветы — гэта скарб еднасці жыцця, светапогляду, псіхалогіі, характару, мовы, вывучэнне і адкрыццё якога неабходныя для нас і нашчадкаў у справе адраджэння і ўзвышэння Беларусі.

**Машанава А.І.,**
аспірантка кафедры
беларускай і сусветнай
мастацкай культуры

## МАЙСТЭРСТВА ПУБЛІЧНАГА ВЫСТУПЛЕННЯ

У нямоўных вышэйшых навучальных установах нашай рэспублікі, на жаль, не прынята вывучаць асновы моўных зносін уласна мастацтва прамоўцы. Гэта вядзе да нізкай моўнай культуры на ўсіх узроўнях бытавых і афіцыйна-дзелавых адносін, тады як у замежнай сістэме адукацыі рыторыцы надаецца значна больш увагі. Вывучэнне моўнай камунікацыі не толькі ўключана ў навучальныя планы, але і ўлічваецца ў пазааўдыторнай рабоце. У прыватнасці, рэгулярна праводзяцца конкурсы па мастацтве прамоўцы.



Репозиторий БГУКИ